■ Парламенцкі дзённік

# АБАВЯЗКОВА МІР

## Дэлегацыя Беларусі возьме ўдзел у 27-й штогадовай сесіі ПА АБСЕ

**Беларускія парламентарыі на чале з намеснікам старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Баляславам Пірштуком адправяцца ў Берлін, дзе з 7 па 11 ліпеня пройдзе чарговая сесія Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе.**

У склад айчыннай дэлегацыі ўваходзяць старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рахманаў і старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Валерый Варанецкі.

Цэнтральнай тэмай сесіі стане выкананне абавязацельстваў у рамках АБСЕ і роля парламентаў у гэтым. Мерапрыемства прысвечана абмеркаванню пытанняў прыняцця дзяржавамі-ўдзельніцамі эфектыўных заканадаўчых мер, накіраваных на ўмацаванне міжнароднага супрацоўніцтва і выкананне абавязацельстваў у дачыненні да падтрымання міру і бяспекі ў рэгіёне АБСЕ.

Запланаваны і шэраг двухбаковых сустрэч — як з кіраўнікамі і членамі дэлегацый дзяржаў — удзельніц арганізацыі, так і з іншымі афіцыйнымі асобамі.

Вынікам сесіі стануць выбары — старшыні ПА АБСЕ, яго намеснікаў, іншых службовых асоб. Таксама будзе прынятая Берлінская дэкларацыя, у якую ўвойдуць тры рэзалюцыі агульных камітэтаў ПА АБСЕ, а таксама шэраг дадатковых рэзалюцый.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ**

■ Факт і каментарый

# ПРОДАЖ ДАЎГОЎ, МАЛЕНЬКІХ І НЕ ВЕЛЬМІ

## У Беларусі пачаў дзейнічаць інстытут сек'юрытызацыі

**Як вядома, з першых дзён ліпеня ў нашай краіне ўступіў у сілу Указ № 54 «Аб фінансаванні камерцыйных арганізацый пад уступку правоў (патрабаванняў)». Дзякуючы гэтаму дакументу ў краіне пачне працаваць інстытут сек'юрытызацыі — новы для нашага рынку механізм прыцягнення фінансавання для банкаў і іншых арганізацый.**

### АКТЫВЫ БАНКА — У «ЖЫВЫЯ» ГРОШЫ

— Калі казаць максімальна проста, то сек'юрытызацыя — гэта продаж даўгоў. Ажыццяўляецца гэты працэс праз спецыяльную фінансавую арганізацыю, — тлумачыць **Жанна КУЛАКОВА, фінансавы кансультант TeleTrade.** — Дапусцім, ёсць банк, які калісьці выдаў мноства крэдытаў на нерухомасць. Ён ужо атрымаў на гэтым нейкі прыбытак, а цяпер хоча вызваліць грошы, «замарожаныя» ў крэдытах, і зноў пусціць іх у абарот. Для гэтага выдадзеныя крэдыты пераводзяцца на баланс спецыяльнай фінансавай арганізацыі (СФА), а яна ўжо выпускае аблігацыі на суму гэтых пазык. Далей аблігацыі прадаюцца ўсім ахвотным інвестарам. Грошы ад продажу атрымлівае банк.

Што мы маем у дадзеным выпадку? Цяпер былыя даўжнікі банка сталі даўжнікамі гэтай самай СФА. Яны будуць, як і раней, плаціць па сваіх крэдытах, а спецыяльная арганізацыя за кошт гэтых сродкаў у будучыні пагасіць выпушчаныя аблігацыі. Аналагічным чынам можна прадаваць не толькі банкаўскія крэдыты, але і, напрыклад, дэбіторскую запазычанасць кампаній.

### ДАЎГІ СА ЗНІЖКАЙ

Пры гэтым продаж даўгоў у рамках сек'юрытызацыі, як правіла, адбываецца з дысконтам, або, інакш кажучы, са зніжкай. Гэта азначае, што СФА будзе павінна вярнуць банку менш грошай, чым каштуе крэдытны партфель, які быў сек'юрытызаваны. Умоўна, калі банк пераводзіць на баланс спецыяльнай арганізацыі 100 млн рублёў, то СФА заплаціць банку не 100 млн, а 99 млн, 98 млн або менш — у залежнасці ад таго, наколькі вялікія рызыкі па дадзеным крэдытным партфелі. Памер дысконту для кожнага канкрэтнага выпадку абмяркоўваецца індывідуальна.

### АЧЫСЦІЦЬ ПАРТФЕЛІ БАНКАЎ

З-за гэтага сек'юрытызацыя не вырашыць праблемы дрэнных даўгоў: калі даўжнік не плаціў па крэдыце банку, то і спецыяльнай арганізацыі ён сапраўды гэтак жа не будзе плаціць. Гэта ўсе разумеюць, і сек'юрытызацыя такіх актываў магчымая толькі з вельмі значным дысконтам. А значыць, банк у любым выпадку панясе фінансавыя страты. Такім чынам, сек'юрытызацыя можа чыста тэхнічна ачысціць партфелі банкаў ад праблемных актываў, але не застрахуе банкі ад страт. Галоўным плюсам сек'юрытызацыі з'яўляецца магчымасць пераўтварыць актывы банка або іншай арганізацыі ў жывыя грошы. Таксама яна дасць стымул для развіцця рынку каштоўных папер. Акрамя таго, дзякуючы сек'юрытызацыі з'явіцца магчымасць драбіць буйныя крэдыты на дробныя часткі і прадаваць іх розным інвестарам, і наадварот — магчымасць аб'ядноўваць мноства дробных пазык у адзін выпуск аблігацый.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Фінансы

# Знешні доўг паменшыўся на 2 %

**Як паведамілі ў Міністэрстве фінансаў, па стане на 1 чэрвеня знешні дзяржаўны доўг склаў 16,4 млрд долараў, зменшыўшыся з пачатку года на 332 млн долараў (з улікам курсавых розніц).**

У студзені — маі прыцягнуты знешнія дзяржаўныя пазыкі на суму 1 млрд 64,9 млн долараў, у тым ліку 600 млн долараў — еўрааблігацыі, 377 млн долараў — урада і банкаў Расіі, 52,7 млн долараў — Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця (МБРР), 33,1 млн долараў — банкаў Кітая. Пагашэнне знешняга дзярждоўгу з пачатку года склала 1 млрд 309,9 млн долараў, з якіх 800 млн долараў — еўрааблігацыі, 213,4 млн долараў — банкам КНР, 174,6 млн долараў — ураду Расіі, 88,3 млн долараў — Еўразійскаму фонду стабілізацыі і развіцця, 32,5 млн долараў — МБРР.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Векапомнае

# Сімвал мужнасці і славы

## Алею мужнасці і адвагі днямі ўрачыста адкрылі ў Нясвіжы

**Яна створана ў гонар 100-годдзя Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і 30-годдзя вываду савецкіх войскаў з Афганістана.**



— На тэрыторыі раёна пражывае больш за сто воінаў-інтэрнацыяналістаў, у тым ліку 97 «афганцаў». У нашых сэрцах заўсёды захоўваецца памяць аб тых, хто не вярнуўся на родную зямлю. Мы ўпэўнены, што дагледжанымі абеліскамі, мемарыяльнымі комплексамі мы з вамі зможам перадаць маладому пакаленню крупінкі нашай гісторыі, — звярнуўся да жыхароў горада і раёна старшыня райвыканкама Генадзь Салавей. — А падрастаючае пакаленне будзе працягваць справу па захаванні памяці тых, хто аддаў жыццё за светлую будучыню. Мы шмат робім у раёне, каб увекавечыць подзвіг нашых землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, выконвалі свой інтэрнацыянальны абавязак. У наступным годзе мы плануем на гэтым месцы ўладкаваць сквер і ўшанаваць памяць загінулых ад рук карнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

З сёлетняга мая ідуць раскопкі пахавання ў Нясвіжы ваеннаслужачымі 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна Міністэрства абароны. Ужо выяўлены астанкі больш як 900 чалавек. У гэтым катлаване смерці знайшлі апошні прытулак старыя, жанчыны, дзеці. Магчыма, гэта і ёсць тое месца, дзе былі расстраляныя 1200 чалавек, пра гібель якіх згадваецца ў кнізе «Памяць. Нясвіжскі раён». Сярод мірных грамадзян знойдзены і астанкі 31 чырвонаармейца, і пяць апазнавальных медальёнаў. Ёсць надзея, што яны дадуць магчымасць высвятліць імёны байцоў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### РАСПАЧАЛАСЯ НАЙБУЙНЕЙШАЯ Ў ГІСТОРЫІ ГАНДЛЁВАЯ ВАЙНА

Кітай і ЗША абмяняліся гандлёвымі пошлінамі на тавары агульнай сумай $68 млрд. «ЗША 6 ліпеня ў 00.01 па мясцовым часе ўвялі ўвазную пошліну на імпарт 818 найменняў тавараў з Кітая агульным аб'ёмам у $34 млрд. У якасці контрмеры Кітай у гэты ж дзень увёў пошліну ў 25 % на імпарт раўназначнага аб'ёму амерыканскіх тавараў», — гаворыцца ў заяве галоўнага мытнага ўпраўлення КНР. «Увядзенне пошлін з'яўляецца прыкладам гандлёвага запалохвання. ЗША парушылі нормы СГА і далі пачатак самай вялікай па аб'ёме гандлёвай вайне ў гісторыі эканомікі. Гэта наносіць сур'ёзную шкоду бяспецы глабальных вытворчых ланцужкоў і перашкаджае працэсу аднаўлення сусветнай эканомікі», — падкрэсліваецца ў афіцыйнай заяве міністэрства камерцыі КНР. Кітайскі бок заявіў, што «для абароны карэнных інтарэсаў дзяржавы і выгады кітайскага народа вымушаны пайсці на неабходны ўдар у адказ». Эксперты папярэджваюць, што далейшы рух па шляху эканамічнай вайны паміж Пекінам і Вашынгтонам пагражае рэцэсіяй для ўсёй сусветнай эканомікі. Юань ужо «патаннеў» на 3,5 % у адносінах да долара, а азіяцкія біржы рызыкуюць «прасесці» ўслед за кітайскімі індэксамі.

### ТЭГЕРАН ПАГРАЖАЕ ЗАКРЫЦЬ АРМУЗСКІ ПРАЛІЎ



Пра магчымасць закрыцця найважнейшага праліва, па якім транспартуецца пакупнікам нафта з Персідскага заліва, заявіў прэзідэнт Ісламскай Рэспублікі Іран Хасан Рухані, які цяпер знаходзіцца ў Еўропе і спрабуе выратаваць здзелку па ядзернай праграме Ірана. Іранскі прэзідэнт лічыцца на Захадзе памяркоўным палітыкам і рэфарматарам, але пасля аднабаковага выхаду з пагаднення Вашынгтона ён пад моцным ціскам іранскіх кансерватараў на чале з аятолай Алі Хаменеі, падобна, таксама заняў жорсткую пазіцыю. Праз некалькі гадзін пасля гучнай заявы Рухані генерал-маёр Касам Сулеймані, адзін з камандзіраў Вартавых іранскай рэвалюцыі, найбольш баяздольнага падраздзялення іранскай арміі, і ўдзельнік баявых дзеянняў у Сірыі і Іраку, паведаміў журналістам, што яго падначаленыя ў любую хвіліну гатовыя выканаць загад Рухані і Хаменеі.

### СВЕТ НАКРЫЛІ ЦЕПЛАВЫЯ ХВАЛІ

Экстрэмальная спякота, якая ахапіла розныя раёны Канады, ЗША, Блізкага Усходу, Вялікабрытаніі і іншых еўрапейскіх краін, б'е тэмпературныя рэкорды, наносіць шкоду сельскай гаспадарцы, становіцца прычынай пажараў і выклікае сур'ёзную трывогу ў медыкаў. У аманскім пасёлку Кураят гэтымі днямі было зафіксавана самае высокае значэнне мінімальнай сутачнай тэмпературы — плюс 42,6 градуса. Перыяды моцнай спякоты, або, як іх называюць у англамоўных краінах, цеплавыя хвалі (англ. heatweave) — з'ява не ўнікальная. Сіноптыкі фіксуюць іх рэгулярна. Але іх частата, працягласць і — у некаторых рэгіёнах — вільготнасць, якая іх суправаджае, маюць тэндэнцыю да росту.

### У ЯПОНІІ ПАВЕСІЛІ КІРАЎНІКОЎ СЕКТЫ «АУМ СІНРЫКЁ»



У Японіі пакараны смерцю заснавальнік рэлігійнай секты «Аум Сінрыкё» Сёка Асахара (ён быў прысуджаны да смяротнага пакарання яшчэ ў 2004-м), а таксама некалькі кіраўнікоў арганізацыі, адказнай за найбуйнейшы тэракт у японскай гісторыі. У сакавіку 1995 года сектанты распылілі атрутны газ зарын у такійскім метро, у выніку чаго загінулі 13 чалавек і пацярпелі каля 6 тысяч. Акрамя Асахары пакараныя Кіёхідэ Хаякава, які выконваў у секце ролю ваеннага міністра, а таксама Тамамаса Накагава і Ёсіхіра Іноўэ. Усе прыгаворы прыведзеныя ў выкананне праз павешанне. Як вядома, рэлігійная секта «Аум Сінрыкё» была заснавана ў 1987 годзе Сёка Асахарай. Колькасць удзельнікаў, па розных звестках, дасягала ад 30 да 50 тысяч чалавек, з іх значная частка знаходзілася ў Расіі, дзе сектанты вялі актыўную дзейнасць.